УДК 343.97

# ЗНАЧЭННЕ КРЫМІНАЛІСТЫЧНАЙ МЕТОДЫКІ РАССЛЕДАВАННЯ РАСКРАДАННЯЎ У СФЕРЫ ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ ФУНКЦЫЙ КРЫМІНАЛІСТЫКІ

**П. А. Капіца**
старшы следчы Ленінскага (г. Мінска) раённага аддзела
Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь,
магістр юрыдычных навук
e-mail: p.kapitsa@sledcom.by

***Анатацыя.*** *Арганізацыйная функцыя крыміналістыкі ў методыцы РРСІ рэалізуецца ў тым, што распрацаваныя рэкамендацыі дазволяць следчаму правільна планаваць сваю працу. Гэта асабліва важна на першапачатковым этапе расследавання. Так, ведаючы, якія дакументы падлягаюць даследаванню па справах аб раскраданнях у галіне распрацоўкі праграмных прадуктаў, следчы можа аператыўна і тактычна правільна правесці вобыскі і адаранні ў арганізацыях, дзе такія дакументы павінны захоўвацца.*

***Ключавыя словы:*** *крыміналістычная методыка, інфарматызацыя, крыміналістыка.*

***Annotation.*** *The organizational function of criminology in the methodology of RRSI is realized in the fact that the developed recommendations will allow the investigator to properly plan their work. This is especially important in the initial phase of the investigation. Thus, knowing which documents are to be investigated in cases of theft in the field of software development, the investigator can quickly and tactically conduct searches and seizures in organizations where such documents must be stored.*

***Keywords:*** *Forensic methodology, informatization, forensics.*

У Беларусі ў цяперашні час інфарматызацыя ўкараняецца ў многія сферы жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства. Прыняты і рэалізуецца шэраг палажэнняў нарматыўных прававых актаў, якімі рэгулюецца інфарматызацыя. Канчатковай мэтай гэтага працэсу, пастаўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, з’яўляецца пабудова IT-краіны [1].

Разам з тым сфера інфарматызацыі можа падвяргацца крымінальнай актыўнасці. Гаворка ідзе пра сітуацыі, калі ў грамадзянска-прававыя адносіны з органамі і арганізацыямі, якім патрабуецца ўкараненне ў дзейнасць высокіх тэхналогій, уступаюць наўмысна нядобрасумленныя выканаўцы. Яны атрымліваюць аплату за распрацоўку праграмнага забеспячэння, але ад пачатку грамадзянска-прававых адносін з заказчыкам не маюць намеру на выкананне (належнае выкананне) сваіх дагаворных абавязацельстваў. Акрамя гэтага, падчас інфарматызацыі дзяржаўных органаў і арганізацый у злачынную

дзейнасць могуць быць уцягнуты не толькі выканаўцы, але і службовыя асобы заказчыкаў, а таксама асобы, упаўнаважаныя арганізоўваць і праводзіць дзяржаўныя закупкі ў гэтай галіне.

Судова-следчая практыка прыцягнення да крымінальнай адказнасці нядобрасумленных выканаўцаў па дагаворах аб стварэнні праграмных прадуктаў і асоб, якія ім садзейнічаюць, пакуль не напрацавана. У сувязі з гэтым узнікае пытанне аб неабходнасці і значэнні распрацоўкі асобнай прыватнай крыміналістычнай методыкі расследавання раскраданняў і злачынстваў супраць інтарэсаў службы ў сферы інфарматызацыі (далей — методыка РРСІ). На нашу думку, адсутнасць у крымінальным працэсе эмпірычнай базы не значыць, што не павінны праводзіцца даследаванні, накіраваныя на прапанаванне навукова-абгрунтаваных рэкамендацый па расследаванні злачынстваў дадзенага віду.

Значэнне методыкі РРСІ найлепш можна раскрыць у кантэксце функцый крыміналістыкі. А. В. Дулаў адзначаў, што вызначэнне функцый навукі дае магчымасць правільна вызначыць напрамак і змест даследаванняў. Навуковец вылучаў наступныя функцыі крыміналістыкі: пазнавальная; прагнастычная; пераўтваральная; сінтэзаваная; арганізацыйная; функцыя стварэння метадычных, тактычных асноў расследавання, тэхнічнага аснашчэння дзейнасці па расследаванні; функцыя акумуляцыі ведаў, метадаў, сродкаў іншых навук [2, с. 10–13].

Кожная з пералічаных функцый крыміналістыкі павінна рэалізавацца ў распрацаванай методыцы РРСІ.

Пазнавальная функцыя крыміналістычнай навукі ў методыцы РРСІ ажыццяўляецца ў апісанні механізма раскраданняў і злачынстваў супраць інтарэсаў службы ў інфарматызацыйнай сферы, выяўленні заканамернасцей паміж дзеяннямі падазроных і пакінутымі імі ў навакольнай рэчаіснасці (няякасна распрацаваныя камп’ютарныя праграмы, дакументы, перапіска і інш.) слядамі-адлюстраваннямі злачынства.

Методыка РРСІ з’яўляецца ўвасабленнем прагнастычнай функцыі крыміналістыкі. Мадэляванне механізмаў раскраданняў у галіне інфарматызацыі і ўзгаданае вышэй вызначэнне заканамернасцей узнікнення слядоў-адлюстраванняў злачыннай дзейнасці дазволяць распрацаваць неабходныя рэкамендацыі па расследаванні такіх злачынстваў. Следчыя не будуць «даганяць» раскрадальнікаў, сутыкнуўшыся з новым відам супрацьпраўнай дзейнасці і вызначаючы сродкі і метады забеспячэння даказвання. Яны змогуць выкарыстаць палажэнні ўжо наяўнай методыкі РРСІ. Таксама варта адзначыць, што прагназаванне павінна быць заснавана не на асабістых уяўленнях даследчыка, а на палажэннях методык расследавання

іншых падобных злачынстваў (раскраданняў у бюджэтнай сферы, у галіне дзяржаўных закупак і інш.), нарматыўных прававых актаў, якімі рэгулюецца інфарматызацыйная сфера, правапрымяняльнай практыкі грамадзянскіх судоў па разгледжанні спрэчак, звязаных з распрацоўкай камп’ютарных праграм.

Пераўтваральная функцыя крыміналістыкі выражаецца ў методыцы РРСІ ў яе прафілактычнай накіраванасці. Па-першае, крыміналістычная методыка павінна змяшчаць навукова-абгрунтаваныя парады па арганізацыі папярэджання ўчынення адпаведных злачынстваў. Напрыклад, гэта рэкамендацыі па ўнясенні ў арганізацыі-заказчыкі прадстаўленняў аб устраненні прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць учыненню злачынстваў з канкрэтнымі прапановамі таго, што патрэбна змяніць у парадку працы арганізацыі, каб прадухіліць учыненне раскраданняў. Па-другое, сама наяўнасць методыкі РРСІ пры дасведчанасці аб ёй магчымых махляроў можа пэўным чынам стрымаць іх ад няякаснага выканання дагаворных абавязацельстваў. Акрамя гэтага, пераўтваральная функцыя рэалізуецца ў распрацоўцы парад па пакрыцці шкоды, прычыненай раскрадальнікамі заказчыкам праграмных прадуктаў.

У методыцы РРСІ сінтэзаваная функцыя крыміналістычнай навукі праяўляецца ў тым, што падчас даследавання адбываецца не толькі апісанне злачынных дзеянняў, але і на падставе абагульненняў робяцца пэўныя высновы і прапануюцца навукова-абгрунтаваныя рэкамендацыі па расследаванні раскраданняў. Напрыклад, вывучыўшы практыку судовай калегіі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па справах інтэлектуальнай уласнасці па разглядзе спрэчак аб распрацоўцы і ўдасканаленні камп’ютарных праграм, можна зрабіць агульную выснову аб тым, што падпісаныя акты выкананых прац ацэньваюцца судом як доказ належнага распрацавання праграмных прадуктаў [3]. Адсюль вынікае той факт, што нядобрасумленныя выканаўцы розным чынам могуць вымушаць прадстаўнікоў заказчыкаў падпісваць акты пры адсутнасці фактычна створаных камп’ютарных праграм. У гэтай сувязі рэкамендацыямі для следчага выступаюць выняцце, агляд і аналіз падпісаных актаў выкананых прац, выяўленне акалічнасцей іх падпісання.

Арганізацыйная функцыя крыміналістыкі ў методыцы РРСІ рэалізуецца ў тым, што распрацаваныя рэкамендацыі дазволяць следчаму правільна запланаваць сваю працу. Гэта асабліва важна на першапачатковым этапе расследавання. Так, ведаючы, якія дакументы падлягаюць даследаванню па справах аб раскраданнях у галіне распрацоўкі праграмных прадуктаў, следчы можа аператыўна і тактычна правільна правесці вобыскі і адабранне ў арганізацыях, дзе такія дакументы павінны захоўвацца.

Рапрацоўка методыкі РРСІ з’яўляецца ўвасабленнем функцыі стварэння метадычных асноў расследавання. Акрамя гэтага, дадзеная методыка павінна змяшчаць і рэкамендацыі па ўзаемадзеянні са спецыялістамі ў галіне камп’ютарнай тэхнікі, праграмавання, па прызначэнні камп’ютарна-тэхнічнай экспертызы, а гэта датычыць тэхнічнага забеспячэння расследавання. Таксама яна можа змяшчаць парады па правядзенні асобных следчых дзеянняў, што адносіцца ўжо да стварэння тактычных асноў расследавання.

Функцыя акумуляцыі ведаў, метадаў, сродкаў іншых навук ў методыцы РРСІ рэалізуецца праз выкарыстанне для арганізацыі паспяховага расследавання ведаў такіх юрыдычных навук, як грамадзянскі працэс, права інтэлектуальнай уласнасці, грамадзянскае, гаспадарчае і фінансавае права, а таксама пэўных ведаў, метадаў і сродкаў інфарматыкі.

Такім чынам, методыка РРСІ цалкам узгадняецца і дазваляе рэалізаваць у адпаведнай частцы ўсе функцыі крыміналістычнай навукі. У гэтым заключаецца значэнне дадзенай методыкі. Разам з тым яе распрацоўка ў дакладнай адпаведнасці з функцыямі крыміналістыкі дазваляе вызначыць правільны напрамак і задачы даследавання, канчатковай мэтай якога з’яўляецца стварэнне эфектыўных рэкамендацый, метадаў і сродкаў выяўлення, раскрыцця, расследавання і прафілактыкі раскраднняў і злачынстваў супраць інтарэсаў службы ў галіне інфарматызацыі.

1. Совещание по проекту Декрета «О развитии цифровой экономики» [Электронный ресурс] // Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь. URL: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/soveschanie-po-proektu-dekreta-o-razvitii-tsifrovoj-ekonomiki-17630/ (дата обращения: 08.01.2020). Вернуться к статье

2. Криминалистика : учеб. пособие / А. В. Дулов [и др.] ; под ред. А. В. Дулова. Минск : Экоперспектива, 1996. 415 с. Вернуться к статье

3. Решения Судебной коллегии по делам интеллектуальной собственности: компьютерные программы [Электронный ресурс] // Интернет-портал судов общей юридисдикции Республики Беларусь. URL: http://www.court.gov.by/ru/justice_rb/praktice/intell/comp/ (дата обращения: 03.02.2020). Вернуться к статье